*А.Г.Хаменка*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ СУЧАСНАГА НАРОДНАГА СВЯТА РАДАЎНІЦЫ

Адно з галоўных месцаў у культуры Беларусі займаюць традыцыйныя святы. У календары святочных дзён Радаўніца стаіць побач з агульнадзяржаўнымі святамі: Днём Перамогі, Днём незалежнасці, Новым годам і іншымі, што сведчыць аб значнай увазе дзяржавы да гэтага свята.

Шырока распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі святочныя дні веснавога памінання продкаў маюць розныя назвы: Радаўніца, Радоніца, Радуніца, Радуніцкія Дзяды, Провады [1,с.101]. Увогуле на тэрыторыі Беларусі і бліжэйшых суседніх краін этнографы ўзгадваюць не менш пятнаццаці розных варыянтаў назвы гэтага народнага свята.

Хрысціянская традыцыя ўшанавання памяці памерлых і продкаў звязана з біблейскімі запаветамі. Дзевяты дзень па хрысціянскім абрадзе ўшанавання памяці нябожчыка з’яўляецца днём сустрэчы душы з іншым светам. І дзевяты дзень пасля Пасхі прыпадае на аўторак (другі тыдзень пасля Вялікадня, які яшчэ завецца ў гонар апостала Фамы – “Фаміным”). Такім чынам, дата святкавання Радаўніцы залежыць ад даты святкавання хрысціянскай Пасхі, якая адзначаецца ў першую нядзелю тыдня пасля веснавога раўнадзенства.

Сучасная традыцыя святкавання Радаўніцы склалася з традыцый, дакладна распрацаваных хрысціянскімі інстытутамі, і народных, якія аб’ядналі ў гэтым свяце адметнасці хрысціянскіх і дахрысціянскіх, язычніцкіх абрадавых дзеянняў, звязаных з веснавымі святамі ўшанавання продкаў і нябожчыкаў.

У апошні час надання Радаўніцы статусу дзяржаўнага свята, імкліва знікаюць, губляюцца лакальныя і рэгіянальныя асаблівасці гэтага свята, неафіцыйныя тэрміны святкавння падпарадкоўваюцца агульнадзяржаўнай традыцыі. Трэба адзначыць, што перанос святкавання Радаўніцы ва урбаністычныя ўмовы суправаджаецца недакладнай трансляцыяй і спрошчанай формай яе святкавання, хаця ў параўнані з іншымі святамі гэтае захавала ў гарадскіх умовах значную частку традыцыйнага абрадавага комплексу. Радаўніца ўвасабляе павагу да продкаў, роду, сям’і, што з’яўляецца падмуркам выхавання любові да Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўным правілам паводзін на свята Радаўніцы да сёняшняга часу з'яўляецца: "Перш чым сабе – продкам" [3, с. 309]. Гэтае правіла адносіцца да ўсіх дзеянняў, якія ладзяцца ў святочны дзень. Перш чым з'есці рытуальныя стравы, неабходна пэўную колькасць пакласці продкам, выпіць мёд ці гарэлку – адліць кроплю на магілу. Да другой паловы XX ст. на тэрыторыі Беларусі большасць сялян прытрымліваліся такой традыцыі: "...на зямлі пачыналі працаваць толькі пасля таго, як напярэдадні Радаўніцы прыбралі могікі" [3, с. 307]. З цягам часу да гэтага правіла ставіліся менш адказна, бо праца на калгасных палетках пачыналася не з улікам традыцыі, а па загаду. Аднак традыцыя працягвала захоўвацца дзякуючы таму, што на асабістых прысядзібных надзелах сяляне пачыналі працаваць з улікам былога правіла. Сацыяльныя паводзіны ў гэты дзень падпарадкоўваюцца традыцыі, якая ў сціслым выглядзе зафіксавала жартоўная народная прымаўка: "Да абеда пашуць, з абеда плачуць, а ў вечары скачуць". Аб'яднанне розных па характары дзеянняў: праца, жалоба, святочная вячэра – сведчыць аб надзвычайна шырокім дыяпазоне эмоцый і пачуццяў, якія павінны закрануць удзельнікаў свята ў гэты дзень. Цікавы факт, што ў сацыялагічным апытанні, якое праводзілася ў Мінскім тэхнікуме прадпрымальніцтва, больш за 70% падлеткаў ва ўзросце ад шаснаццаці да васемнаццаці гадоў на пытанне: "Якое свята вы святкуеце разам з бацькамі?" – адказалі, што святкуюць разам менавіта Радаўніцу. Гэта сведчыць аб тым, што сёння гэтае свята адыгрывае вялікую ролю ў грамадскім жыцці. Замацаванне каштоўнасных прыярытэтаў Радаўніцы, сярод якіх можна вылучыць маральна-камунікатыўныя, эстэтычныя, экзістэнцыяльныя, будуць спрыяць развіццю станоўчых сацыякультурных працэсаў у сучасным грамадстве.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя вывады:

– трывалае жаданне беларускага грамадства захаваць сваю гісторыю, традыцыйную культурную спадчыну ўвасобілася ў дзяржаўнай ўвазе да свята Радаўніцы;

– доўгатэрміновае суіснаванне хрысціянскай і народнай традыцый святкавання Радаўніцы прывяло да таго, што гэтая з'ява стала духоўна-культурнай;

– хрысціянскія і народныя традыцыі святкавання Радаўніцы павінны не выціскаць адана адну, а ўзбагачаць традыцыю свята;

– традыцыя святкавання Радаўніцы прапануе грамадству

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаваць агульначалавечую каштоўнасць павагі да зямлі, продкаў, роду, сям'і;

– беларускія народныя святы з'яўляюцца магутным сродкам захавання і развіцця культуры.

______________

*1. Лозка, Алесь.* Беларускі народны каляндар: 2-е выд. / Алесь Лозака. – Мн.: Полымя, 2002.

*2. Восточно-славянский* фольклор: словарь научной и народной терминологии. – Мн.: Наука и тэхника, 1993.

*3. Катовіч, А.* Веснавыя святы / А.Катовіч, Я.Крук. – Мн.: Маст. літ., 2005. – Т. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*А.Г.Хаменка*

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ СУЧАСНАГА НАРОДНАГА СВЯТА РАДАЎНІЦЫ

Адно з галоўных месцаў у культуры Беларусі займаюць традыцыйныя святы. У календары святочных дзён Радаўніца стаіць побач з агульнадзяржаўнымі святамі: Днём Перамогі, Днём незалежнасці, Новым годам і іншымі, што сведчыць аб значнай увазе дзяржавы да гэтага свята.

Шырока распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі святочныя дні веснавога памінання продкаў маюць розныя назвы: Радаўніца, Радоніца, Радуніца, Радуніцкія Дзяды, Провады [1,с.101]. Увогуле на тэрыторыі Беларусі і бліжэйшых суседніх краін этнографы ўзгадваюць не менш пятнаццаці розных варыянтаў назвы гэтага народнага свята.

Хрысціянская традыцыя ўшанавання памяці памерлых і продкаў звязана з біблейскімі запаветамі. Дзевяты дзень па хрысціянскім абрадзе ўшанавання памяці нябожчыка з'яўляецца днём сустрэчы душы з іншым светам. І дзевяты дзень пасля Пасхі прыпадае на аўторак (другі тыдзень пасля Вялікадня, які яшчэ завецца ў гонар апостала Фамы – "Фаміным"). Такім чынам, дата святкавання Радаўніцы залежыць ад даты святкавання хрысціянскай Пасхі, якая адзначаецца ў першую нядзелю тыдня пасля веснавога раўнадзенства.

Сучасная традыцыя святкавання Радаўніцы склалася з традыцый, дакладна распрацаваных хрысціянскімі інстытутамі, і народных, якія аб'ядналі ў гэтым свяце адметнасці хрысціянскіх і дахрысціянскіх, язычніцкіх абрадавых дзеянняў, звязаных з веснавымі святамі ўшанавання продкаў і нябожчыкаў.

У апошні час надання Радаўніцы статусу дзяржаўнага свята, імкліва знікаюць, губляюцца лакальныя і рэгіянальныя асаблівасці гэтага свята, неафіцыйныя тэрміны святкаўння падпарадкоўваюцца агульнадзяржаўнай традыцыі. Трэба адзначыць, што перанос святкавання Радаўніцы ва урбаністычныя ўмовы суправаджаецца недакладнай трансляцыяй і спрошчанай формай яе святкавання, хаця ў параўнані з іншымі святамі гэтае захавала ў гарадскіх умовах значную частку традыцыйнага абрадавага комплексу. Радаўніца ўвасабляе павагу да продкаў, роду, сям'і, што з'яўляецца падмуркам выхавання любові да Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўным правілам паводзін на свята Радаўніцы да сёняшняга часу з'яўляецца: "Перш чым сабе – продкам" [3, с. 309]. Гэтае правіла адносіцца да ўсіх дзеянняў, якія ладзяцца ў святочны дзень. Перш чым з'есці рытуальныя стравы, неабходна пэўную колькасць пакласці продкам, выпіць мёд ці гарэлку – адліць кроплю на магілу. Да другой паловы XX ст. на тэрыторыі Беларусі большасць сялян прытрымліваліся такой традыцыі: "...на зямлі пачыналі працаваць толькі пасля таго, як напярэдадні Радаўніцы прыбралі могікі" [3, с. 307]. З цягам часу да гэтага правіла ставіліся менш адказна, бо праца на калгасных палетках пачыналася не з улікам традыцыі, а па загаду. Аднак традыцыя працягвала захоўвацца дзякуючы таму, што на асабістых прысядзібных надзелах сяляне пачыналі працаваць з улікам былога правіла. Сацыяльныя паводзіны ў гэты дзень падпарадкоўваюцца традыцыі, якая ў сціслым выглядзе зафіксавала жартоўная народная прымаўка: "Да абеда пашуць, з абеда плачуць, а ў вечары скачуць". Аб'яднанне розных па характары дзеянняў: праца, жалоба, святочная вячэра – сведчыць аб надзвычайна шырокім дыяпазоне эмоцый і пачуццяў, якія павінны закрануць удзельнікаў свята ў гэты дзень. Цікавы факт, што ў сацыялагічным апытанні, якое праводзілася ў Мінскім тэхнікуме прадпрымальніцтва, больш за 70% падлеткаў ва ўзросце ад шаснаццаці да васемнаццаці гадоў на пытанне: "Якое свята вы святкуеце разам з бацькамі?" – адказалі, што святкуюць разам менавіта Радаўніцу. Гэта сведчыць аб тым, што сёння гэтае свята адыгрывае вялікую ролю ў грамадскім жыцці. Замацаванне каштоўнасных прыярытэтаў Радаўніцы, сярод якіх можна вылучыць маральна-камунікатыўныя, эстэтычныя, экзістэнцыяльныя, будуць спрыяць развіццю станоўчых сацыякультурных працэсаў у сучасным грамадстве.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя вывады:

– трывалае жаданне беларускага грамадства захаваць сваю гісторыю, традыцыйную культурную спадчыну ўвасобілася ў дзяржаўнай ўвазе да свята Радаўніцы;

– доўгатэрміновае суіснаванне хрысціянскай і народнай традыцый святкавання Радаўніцы прывяло да таго, што гэтая з'ява стала духоўна-культурнай;

– хрысціянскія і народныя традыцыі святкавання Радаўніцы павінны не выціскаць адана адну, а ўзбагачаць традыцыю свята;

– традыцыя святкавання Радаўніцы прапануе грамадству

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаваць агульначалавечую каштоўнасць павагі да зямлі, продкаў, роду, сям'і;

– беларускія народныя святы з'яўляюцца магутным сродкам захавання і развіцця культуры.

______________

1. *Лозка, Алесь.* Беларускі народны каляндар: 2-е выд. / Алесь Лозака. – Мн.: Полымя, 2002.

2. *Восточно-славянский* фольклор: словарь научной и народной терминологии. – Мн.: Наука и тэхника, 1993.

3. *Катовіч, А.* Веснавыя святы / А.Катовіч, Я.Крук. – Мн.: Маст. літ., 2005. – Т. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ